■ Пасля падзеі

# «БРОНЗАВЫЯ» ПРЫГАЖУНІ

## Нашы дзяўчаты занялі 3-е месца на хатнім чэмпіянаце Еўропы па індархакеі

**Мінскі Палац спорту на мінулых выхадных прымаў кантынентальнае першынство па індархакеі сярод жаночых каманд. Спартыўныя дзяўчаты ў кароткіх спадніцах і яркіх гетрах на працягу трох дзён змагаліся за званне наймацнейшых у гэтым відзе спорту. У Мінску сабраліся восем дружын Еўропы, на коне былі не толькі медалі гэтага турніру, але і пуцёўкі на планетарнае першынство.**

Індархакей — гэта аналаг хакея на траве. Розніца ў пляцоўцы: тут гуляюць на паркеце, плошча поля і памер клюшак меншыя, у гульні адначасова прымаюць удзел не 11, а 5 чалавек. У гэтых правілах беларускія аматары спорту разабраліся хутка і «хварэлі» за сваіх суайчынніц адчайна і гучна, як яны гэта ўмеюць.



Спартсменкі нашай зборнай, якіх трэніруе галандскі спецыяліст Херман Круіз, ад старту турніру далі зразумець і сапернікам, і заўзятарам, што настроены вельмі сур'ёзна. У першы ж дзень спаборніцтваў наша каманда адолела грозных саперніц з Германіі, а яны, дарэчы, неадназоразовыя чэмпіёнкі Еўропы і свету. Потым перайграла ўкраінак і забяспечыла сабе месца ў паўфінале, дзе нашых чакалі полькі. Матч з суседкамі выдаўся вельмі складаным, лік пасля асноўнага часу сустрэчы — 1:1, па рэгламенце далей вынікаюць буліты. Латарэя — менавіта так называюць гэты складнік гульні многія спецыялісты. На жаль, у той вечар фартуна апынулася на баку гасцей.

У нядзелю беларускія хакеісткі выйшлі змагацца за бронзавыя медалі ўсё з тымі ж немкамі, якія ў паўфінале саступілі дзяўчатам з Галанды. Сказаць, што сустрэча выйшла напружанай, — значыць не сказаць нічога, бо гаспадыні паркета толькі на апошніх хвілінах матча змаглі закінуць вырашальны мяч. Лік — 6:5, і бронзавыя медалі ў беларускіх прыгажунь.

***Рыта БАТУРА, капітан зборнай Беларусі:***

*— Мы ведалі, што матч за бронзавыя ўзнагароды з немкамі будзе вельмі складаным, таму што каманда Германіі — фаварыты, яны ўвесь час гуляюць у фіналах чэмпіянатаў, за «бронзу» дзяўчаты выйшлі змагацца сур'ёзна. Паколькі мы сустракаліся з гэтай камандай у першы дзень турніру, то саперніц ужо ведалі, і ведалі, што яны нас пабойваюцца. Можа, гэта дадало нам упэўненасці. А ў паўфінальным матчы з Польшчай, вядома, павінны былі перамагаць да серыі булітаў, але недзе, напэўна, паўплывала хваляванне, таму не змаглі. Тым не менш перад кожнай гульнёй настройваліся толькі на перамогу, і калі чулі такую выдатную падтрымку трыбун, былі вельмі рады. Дзякуючы гэтаму і вырвалі перамогу ў апошняй сустрэчы чэмпіяната. Наогул спаборніцтвы ў Мінску прайшлі на высокім узроўні, на маёй памяці — гэта найлепшы чэмпіянат Еўропы. Ведаю, што дзяўчатам з іншых каманд таксама спадабаўся турнір у Беларусі.*

***Крысціна ПАПКОВА, гулец зборнай Беларусі:***

*— У нашай перамозе вялікая заслуга трэнера, ён вельмі дапамог нам. Тое, што Херман сядзеў на трыбуне, а не побач, дазваляла яму глядзець на нас з іншага боку, бачыць нашы перасоўванні па пляцоўцы, заўважаць усе памылкі. Ён своечасова ўносіў змены ў нашу гульню праз асістэнтаў па рацыі. У цэлым гульнёй каманды на турніры мы вельмі задаволеныя: па сутнасці, мы не прайгралі ніводнага матча, таму што буліты — гэта латарэя. Калі казаць пра самую цяжкую сустрэчу, то такую вылучыць складана, таму што каманды моцныя і мы настройваліся на ўсе гульні аднолькава, выкладваліся на ўсе сто працэнтаў.*

Адзначым, што раней на чэмпіянатах Еўропы па індархакеі беларускі двойчы станавіліся сярэбранымі прызёрамі спаборніцтваў, але пакуль так і не падняліся на самую высокую прыступку п'едэстала. Акрамя бронзавых узнагарод, нашы дзяўчаты атрымалі права ўдзельнічаць у чэмпіянаце свету 2018 года.

Залатыя медалі чэмпіянату Еўропы ў Мінску выйгралі спартсменкі з Галандыі, другія — полькі. Беларуска Крысціна Папкова прызнана найлепшым гульцом чэмпіянату; найлепшымі снайперамі сталі Адэль Бізава з Чэхіі і Ліек Ван Вік з Нідэрландаў, якія закінулі па 8 мячоў, найлепшым галкіперам турніру прызнана ўкраінка Таццяна Сцяпанчанка. Прызам за сумленную гульню была адзначана каманда Украіны.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.07 | 17.38 | 8.31 |
| Віцебск — | 9.02 | 17.22 | 8.20 |
| Магілёў — | 8.57 | 17.28 | 8.31 |
| Гомель — | 8.47 | 17.31 | 8.44 |
| Гродна — | 9.21 | 17.54 | 8.33 |
| Брэст — | 9.16 | 18.01 | 8.45 |

**Месяц**

*Поўня 24.01—31.01.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Елізара, Пятра, Якава.*
***К.*** *Ванды, Паўліны, Палікарпа, Цімафея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**У каго меншы кліранс, той і дарогу ад снегу чысціць.**

Калі паглядзець мультфільм «Прыгажуня і Пачвара» задам наперад, то атрымаецца гісторыя пра дзяўчыну, якая выйшла замуж за прыгожага прынца, потым давяла яго сваім каханнем і ператварыла ў жудасную пачвару, пасля ўсяго гэтага ўцякла да бацькі і жыла доўга і шчасліва.

**— Мы сустракаемся з табой ужо паўгода. І ў мяне нарэшце ўзнікла пытанне — ты сапраўды хочаш варыць мне боршч, гладзіць кашулі, мыць шкарпэткі?**

**— Гэта ты мне зараз прапанову замуж робіш?**

Прадказаць любы дурань можа. І толькі сапраўдны эксперт можа растлумачыць, што перашкодзіла прадказанням спраўдзіцца.




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

Даты | Падзеі | Людзі

### 26 СТУДЗЕНЯ

**1651** год — 365 гадоў таму нарадзіўся Ілья Фёдаравіч Капіевіч, выдавец і друкар. Ураджэнец Беларусі. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі, затым у Галандыі. З 1698 года працаваў у Амстэрдаме ў друкарні Я. Тысінга, якому рускі цар Пётр І даў прывілей на друкаванне кніг на рускай мове. Склаў і падрыхтаваў да друку «Введение краткое во всякую историю...», «Краткое и полезное руководение во арифметику», «Краткое собрание Льва Миротворца» і інш. Надрукаваў на лацінскай і рускай мовах спіс выпушчаных або падрыхтаваных ім да друку кніг «Рядовой чин, им же книги именуются» — першы друкаваны рускі бібліяграфічны дапаможнік. У 1700 годзе заснаваў у Амстэрдаме ўласную друкарню, у якой друкаваў кнігі на рускай, лацінскай, польскай і іншых мовах, удасканаліў кірыліцу. З 1707-га жыў у Варшаве, затым у Расіі (працаваў перакладчыкам у Пасольскага прыказе). Памёр у 1714 годзе.



**1924** год — Петраград быў перайменаваны ў Ленінград. Статус сталіцы Расіі горад меў у 1712—1728 і ў 1732—1918 гадах. Пасля ўступлення краіны ў Першую сусветную вайну ў 1914 годзе імператар Мікалай ІІ падпісаў акт аб перайменаванні Санкт-Пецярбурга ў Петраград. У 1917 годзе горад стаў месцам Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. Пасля таго, як памёр У.І. Ленін, на ІІ з'ездзе Саветаў 26 студзеня 1924 г. Петраград пастанавілі назваць Ленінградам, каб увекавечыць памяць правадыра пралетарыяту. Гістарычная назва Санкт-Пецярбург вярнулася да горада ў 1991 годзе.

**1938** год — нарадзіўся (вёска Ходараўцы Лідскага раёна) Аляксандр Віктаравіч Шарапа, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук (1988), прафесар (1989), заслужаны работнік адукацыі Беларусі (1990). Аўтар больш як ста навуковых публікацый, у тым ліку трох манаграфій, шэрагу навучальных дапаможнікаў.

### Было сказана

**Еўдакія ЛОСЬ, паэтэса:**

*«Вялікія людзі нашчадкам у генах Заўжды завяшчаюць любоў».*

Дарагую пляменніцу **Ванду Іванаўну ЧАБАТАРЭНКУ,**
дырэктара Дома культуры ў вёсцы Вялікія Круговічы, шчыра віншую з днём народзінаў.
*Зычу моцнага здароўя, дабрабыту і ў Год культуры — плённай працы на карысць радзіме!*
**Т.І. НОВІК**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.956. Індэкс 63850. Зак. № 303.

Нумар падпісаны ў 19.30 25 студзеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12